8 верасня  2022 года прайшлі музейныя заняткі для  вучняў  5 класаў на тэму:   “Беларуская хата шчодрая і багатая”. Рабяты пазнаёміліся з побытам беларусаў, рэчамі, якія знаходзіліся ў кожнай беларускай хаце, папоўнілі свой слоўнікавы запас новымі назвамі: калаўрот, андарак, гарлач, дзежка, сподкі, куфар, ручнік і інш. З вялікай цікавасцю слухалі, як нашы продкі вышывалі ручнікі, шылі адзенне, ткалі палатно, шанавалі зямлю, хлеб і жыццё.

Ой, заходзьце  ў госці
Ды ў нашу хату!
Хата наша не багата,
Заўжды гасцям  рада !

Сёння мы пагаворым з вамі пра куфар. Ён зараз амаль выціснуты шафаю. Адкрыем куфар. І праз куфар- адкрыем і жыццё нашых продкаў.

Вось стаяць, як полі, сувоі белага ільнянога палатна. І можна ўспомніць, як, дзяўчынаю ўжо, церла гэты лён і прала, віла і снавала, і як у маі ўвесь свет быў белы: ад вішань, ад яблынь, ад палотнаў на лузе пад сляпучым сонцам.

Далей ляжаць розна вышытыя ручнікі. На іх "сінія валошкі з макамі ў вяночак, галубок і пеўнік, ягады каліны, нагаткі, рамонкі, гожыя вяргіні. Па канцах карункі тонкім павуціннем…"

Ляжаць белыя "кашулі", вышытыя па каўняры і рукавах. Тут жа спадніцы з сукна, так званыя "андаракі". Густа-сінія, зялёныя, часцей чырвоныя, як жар.Тканы андарак — гэта сапраўдны твор мастацтв.Урэшце фартухі і хусткі.Цёмныя на жалобу, ясныя — на свята, на нядзелю, у гасціну.

Шануйце і беражыце нашу спадчыну, сябры, тое , што пакінулі  нам продкі, бо гэта самы каштоўнейшы скарб з усяго, што мы маем. Шануй чужое аж да пакланення, сваё ж любі да самазабыцця.

Заходзьце да нас у госці, бо яшчэ далёка не ўсе сакрэты раскрыла для вас наша бабуліна хата.
Настаўнік беларускай мовы і літаратуры: Ганчарова І.А.



